Были вновь восстановлены смертная казнь и политический сыск. Однако демократические идеалы Февральской революции, и в их числе идея Учредительного собрания, продолжали жить в других регионах России.

Советы как общественно-политическое завоевание Февраля и основа гражданского общества перестали существовать и после большевизации превращены в органы государственной власти.

Правда, в экономической сфере большевики пошли значительно дальше Февраля. Они осуществили национализацию банков, предприятий, аптек, домовладения, земельной собственности и т. д. Вместе с тем в Беларуси задачи достижения мира, решения аграрного и продовольственног вопросов, национализация заводов и фабрик, проблемы белорусской государственности и польского движения еще более усложнились.

УДК 947.6. «1917»

І.М. Рыжанкоў, канд. гіст. навук, дац. (БДТУ, г. Мінск)

## БАРАЦЬБА З ТАЙНЫМ ВІНАКУРЭННЕМ У КАНТЭКСЦЕ РЭАЛІЗАЦЫІ ХЛЕБНАЙ МАНАПОЛІІ (люты – кастрычнік 1917 г.)

У ліку іншых праблем, якія непакоілі дзяржаву і грамадства напярэдадні Лютаўскай і нават пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, з'яўлялася самагонаварэнне на вёсцы. Пасля звяржэння самаўладдзя ва ўмовах складанай харчовай сітуацыі ў краіне яно істотна зніжала паступленне прадуктаў на фронт і ў гарады. Невыпадкова, першае, што ставілася ў абавязак зноў створаным валасным камітэтам, гэта барацьба з ім.

Так, на агульным сходзе Веляшкоўскага валаснога камітэта, Віцебскага пав. было пастаноўлена асобам, заўважаных у тайным вінакурэнні, не выдаваць талонаў на атрыманне жыта і харчавання.

З гэтай жа нагоды Вымнянскі валасны агульны сход пастанавіў, каб асоб, якія займаліся вытворчасцю і гандлем самагонкі, запісваць на чорную дошку і пазбаўляць права голасу і ўдзелу ў грамадскіх справах, а таксама займаць грамадскія пасады. Акрамя гэтага, шэраг асоб, якія былі заўважаны ў вырабе і продажы самагонкі падлягалі штрафу ў 1500 руб.

«Крестьянская газета» ад 21 чэрвеня 1917 г. паведамляла, што Мільчанскі валасны камітэт вырашыў перасекчы «тайнае вінакурэнне і продаж гарэлкі, для чаго даручыў валасному, грамадскаму і сельскім выканаўчым камітэтам строга даглядаць за вінакурэннем і ўсімі

магчымымі спосабамі перапыніць, прыцягваючы вінаватых да законнай адказнасці».

Што датычыць канкрэтных мерапрыемстваў валасных камітэтаў, скіраваных супраць вінакурэння, то ў маштабах прыфрантавога рэгіёну яны былі вельмі рэдкімі і не прыносілі плёну. Барацьбу супраць самагонаварэння вялі харчовыя камітэты, земствы, Саветы дэпутатаў і іншыя грамадскія аб'яднанні, але і іх дасягненні нельга назваць значнымі [1]. Гэта тлумачылася нешматлікасцю міліцыі; замкнёнасцю вясковага грамадства, і нарэшце, галоўнае, эканамічнай зацікаўленасцю сялянства ў камерцыйным вырабе спіртавых напояў, якая была мацней за страх пакарання і грамадзянскае сумленне.

Эканамічная выгада нелегальнага вырабу сялянамі самагону на продаж была відавочнай. Так, у верасні, паводле паведамлення камісара Балая, перагонка збожжа на «спірт» давала ім да 100 руб. прыбытку з аднаго пуда жыта [2]. Невыпадкова ў Веліжскім пав. пераганялася штодзень да 1 000 пуд. жыта, што «магло б пракарміць да 30 000 чалавек, ці 6 000 сямей» [3]. Падобная сітуацыя склалася ў Магілёўскай губ., дзе напачатку восені вырабам самагону займалася амаль усё вясковае насельніцтва [4].

Па словах прадстаўнікоў харчовых арганізацый, Мінская губ. ператварылася «ў адзіны каласальны вінакурны завод, які забяспечвае гарэлкай-самагонкай фронт… Сяляне не даюць гораду хлеба, а каласальная колькасць пудоў жыта і бульбы ідзе на перагонку спірту, які паўсюдна распрадаецца па высокіх цэнах» [5]. Відавочна, што нават пры чарговым урадавым павышэнні «цвёрдых цэн» на збожжа і іншыя прадукты, устойлівы попыт вайскоўцаў на алкаголь забяспечваў сялянам такі ж устойлівы прыбытак. Напэўна ў гэтым, адна з асноўных прычын таго, што ўсе сродкі барацьбы органаў Часовага ўрада ўлады супраць гэтай з'явы так і не далі дзейсных вынікаў.

Газета «Могилевская жизнь» ад 4 кастрычніка 1917 г. у даволі іранічнай форме адзначала, што «існуе адна галіна прамысловасці, якой не кранулася агульная разруха, гэта – «самагонная» прамысловасць. З тайнага самагона вінакурэнне зрабілася яўным. У вёсках і сёлах усе заняты вырашэннем тэхнічных пытанняў, звязанных з самагонай прамысловасцю. Грамадзянкі гутараць аб тым колькі бутэлек можна атрымаць з жыта ці бульбы, як устанаўліваць вінакуранные апараты, дзе збываць самагонку. П'юць пагалоўна ўсе і бутэлька самагонкі павысілась да 5 руб. ні міліцыя, ні акцызный дагляд не могуць весці барацьбу з эпідэміяй п'янства, таму шта ў іх

няма ні аўтарытэта, ні сілы. П'янства не лічыцца злом, а неабходнай… у сумным вясковым жыцці» [6].

Варта адзначыць, што ў верасні–кастрычніку 1917 г. харчовая праблема ў Расіі і ў неакупіраваных беларускіх губернях працягвала абвастрацца. Сялянства парушала дамовы з памешчыкамі і арандатарамі, узятыя абавязацельствы па пастаўках фуражу, ухілялася ад рэквізіцый, паколькі з часу заключэння здзелак цэны імкліва перавышалі абумоўлены кошт. Ацаніць ролю таемнага вінакурэння ў абвастрэнні харчовага крызісу даволі складана, але відавочна што гэта дрэнна адбівалася на забеспячэнні франтавікоў і іх маральна-псіхалагічным настроі, а таксама на аўтарытэце кабінетаў Часовага ўрада.

ЛІТАРАТУРА

1. Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Фонд 60. Воп. 3. Спр. 168. Л. 55-57.
2. НАРБ. Фонд 60. Воп. 3. Спр. 158. Л. 23.
3. П-ов. По губернии // Витебское слово. – 1917.– 6 октября. – С. 3.
4. Письмо в редакцию. Куда мы идем? // Могилевская жизнь. – 1917. – 12 сентября. – С. 4.
5. Минская губерния – огромный винный завод // Бобруйский курьер. – 1917. – 12 октября. – С. 2.
6. По губ-нии // Могилевская жизнь. – 1917. – 4 октября. –1917. – С. 4.

УДК 655.4/.5(476) "1920/1929"

І.У. Каляда, канд. гіст.навук, дац. (БДТУ, г. Мінск)

## ВЫДАВЕЦКАЯ СПРАВА НА БЕЛАРУСІ: АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ Ў 1920-я ГАДЫ

Развіццё беларускай мовы і пашырэнне сферы яе ўжывання ў 1920-я гады павялічыла патрэбу ў беларускай кнізе, падручніку, часопісе. У студзені 1921 года Прэзідыум ЦВК БССР прыняў пастанову «Аб утварэнні Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі і цэнтралізацыі друкарскай справы». Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі (ДВБ) ўтваралася на базе створанага ў лістападзе 1920-га года Беларускага аддзялення Дзяржаўнага выдавецтва РСФСР. Акрамя падрыхтоўкі ўласных выданняў яму даручана было рэгуляванне ўсёй выдавецкай дзейнасці на Беларусі, улік і размеркаванне паперы,